НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# Анлайн-конкурс чытальнікаў “О, Беларусь, мая шыпшына”, прымеркаванага да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі ў рамках праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”

Уладзімір Дубоўка зрабіў каштоўны ўнёсак у скарбніцу нацыянальнай культуры, узбагаціўшы беларускую літаратуру яркімі паэтычнымі творамі. Яго бліскучы талент стварыў новы, кранальны і ўзвышаны вобраз Беларусі часу бурлівых грамадскіх перамен.

**Мэта конкурсу** – далучэнне шырокай грамадскасці да святкавання 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі, а таксама прыцягненне ўвагі да новага раздзела віртуальнага праекта НББ “На хвалі часу, у плыні жыцця”, прысвечанага творчасці паэта.

**Задачы:**

- папулярызацыя творчасці беларускага пісьменніка У. Дубоўкі;
- павышэнне цікавасці грамадства да беларускай літаратуры і скарбаў нацыянальнай культуры;
- прыцягненне ўвагі грамадскасці да фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, даступных анлайн;
- развіццё творчага патэнцыялу асобы.

**Арганізатар:** Нацыянальная бібліятэка Беларусі.
**Інфармацыйныя партнёры:** часопісы “Маладосць” (РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”) і “Бярозка”.
**Удзельнікі конкурсу:** усе жадаючыя
**Тэрміны конкурсу:** ***1 кастрычніка – 15 лістапада 2020 г.***
**Конкурсныя работы:** анлайн-выступленне з выразным чытаннем вершаў Уладзіміра Дубоўкі.

**Умовы конкурсу:**

1. Удзельнік запісвае сваё чытанне верша паэта на відэа (абавязкова напачатку назваўшы сябе і агучыўшы назву твора), запампоўвае відэазапіс на любы файлаабменнік і дасылае на электронную пошту konkurs.dubowka120@gmail.com спасылку на свой запіс. У лісце таксама паведамляе свае імя і прозвішча, узрост, горад пражывання, месца вучобы/працы, кантактны нумар тэлефона.
2. Заяўкі на конкурс прымаюцца з **1 кастрычніка па 15 лістапада 2020 г.**

3. Удзельнік дазваляе выкарыстоўваць сваю конкурсную работу на партале бібліятэкі, у сацыяльных сетках з абавязковым пазначэннем аўтарства.

Творчыя работы будуць ацэнены журы, якое вызначыць пераможцаў.

**Крытэрыі ацэнкі відэа:** выразнасць чытання і артыстычнасць выканання.

Акрамя таго, плануецца прыз для пераможцы глядацкіх сімпатый *(відэачытанне, якое атрымае найбольшую колькасць падабаек у сацсетках)* і прыз сімпатый рэдакцыі часопіса “Маладосць”.

Пераможцы будуць абвешчаны ***19 лістапада 2020 г.***

**У склад журы** ўваходзяць супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выкладчыкі, акцёры і іншыя эксперты.

**Узнагароды пераможцам конкурсу:**

Тры пераможцы, якія зоймуць I–III месцы, будуць адзначаны:

- памятнымі дыпломамі;
- запрашэннем на мерапрыемства, прысвечанае творчасці пісьменнікаў літаб’яднання “Маладняк”, якое пройдзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў студзені;
- бясплатнай экскурсіяй па бібліятэцы (з наведваннем музея кнігі і пад’ёмам на аглядную пляцоўку);
- размяшчэннем конкурснай работы і інфармацыі пра аўтара на партале і ў сацсетках бібліятэкі, а таксама на інфармацыйных рэсурсах часопісаў “Бярозка” і “Маладосць”;
- кнігамі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”;
- падарункамі ад часопісаў “Маладосць” і “Бярозка”.

Акрамя галоўных пераможцаў, дзесяць лепшых работ і пераможца глядацкіх сімпатый будуць адзначаны:

- памятнымі дыпломамі;
- бясплатнай экскурсіяй па бібліятэцы (з наведваннем музея кнігі і пад’ёмам на аглядную пляцоўку);
- размяшчэннем інфармацыі пра аўтараў на партале і сацсетках бібліятэкі, сайтах часопісаў “Маладосць”,“Бярозка”;
- прадугледжаны спецыяльны прыз ад часопіса “Маладосць” (прыз сімпатый рэдакцыі).

**Вынікі конкурсу** будуць абвешчаны на партале www.nlb.by і ў сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама на старонках і сацыяльных сетках часопісаў “Маладосць” і “Бярозка”.

Тэлефоны для даведак: 293-27-19, 293-29-69 ці пішыце на электронную крынку oniki@nlb.by